*Ганна Новік*

# ДЫЯЛОГАВАЯ ФУНКЦЫЯ ВОБРАЗА ДАМАВІКА Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Творчыя інавацыі апошніх дваццаці гадоў у гісторыі беларускай літаратуры ледзь не да апошняга моманту заставаліся з'явай маргінальнай. Але гэта не ёсць сведчаннем таго, што іх не існавала на Беларусі. На тэрыторыі нашай краіны яны акрэсліваліся як адзін са сродкаў барацьбы з правінцыялізмам, адсутнасцю дэмакратыі як ментальнага выбару.

Ва ўмовах пераломных грамадска-палітычных зрухаў (з сярэдзіны 80-х), калі быў разгайданы падмурак матэрыяльнага і духоўнага свету беларуса, час нарадзіў людзей, якія выйшлі за межы сваёй культуры і свет успрымалі як гіпертэкст. Яны будавалі свае творы з цытатаў, не даючы спасылак, і такім чынам выдавалі чужое за сваё, скептычна ставячыся да ўсяго. Аднак беларусы выбіраюць тут характэрны для свайго менталітэту шлях – заглыбленне ў міфа-паэтычную рэфлексію.

Адным з самых моцных першародных пачуццяў з'яўляецца жах, і наймацнейшы жах выклікае невядомае. Імкнучыся супрацьстаяць жаху, нашыя продкі «ачалавечвалі» яго праз наглядныя формы, надзялялі рысамі той ці іншай істоты і разам з тым вынаходзілі сродкі засцярогі. Прага бяспекі знайшла адбітак у вялікім пласце фальклору, звязаным з верай у звышнатуральнае.

Вобразы «цёмных сілаў» знайшлі выяўленне і ў сучаснай беларускай літаратуры. Паводле сведчанняў літаратуразнаўцаў, актуалізацыя з'явы прыпадае на гады перабудовы і звязана з імкненнем запоўніць пустку, якая з'явілася пасля частковага вызвалення калектыўнай свядомасці ад ідэалогіі савецкага грамадства. Гарады засяліліся «зборышчам лесавікоў, палевікоў, хутаў, вупыроў, русалак і кадукоў з балотаў, азёраў, лугоў, рэк, бароў, урочышчаў і гаёў блакітнавокай Беларусі. Уся гэтая чартаўшчына асела ў горадзе разам з перасяленцамі з вёсак, якія прынеслі свой напалову паганскі светапогляд разам з сялянскімі забабонамі, прымхамі і страхамі» [1, *26*]. Гарадскі фальклор спарадзіў попыт на псеўдаміфалагічных герояў і трансфармацыю звыклых вобразаў дэманалогіі. Тыповы прыклад – вобраз дамавіка (хатніка, гаспадара, падпечніка), у якім пры захаванні старажытнага семантычнага ядра з'яўляюцца новыя рысы.

Дух хаты ў беларускай міфалогіі цесна звязаны з культам продкаў і гаспадарчым дабрабытам сям'і. Як і пэўная частка іншых дэманаў, ён мог прымаць антрапаморфны выгляд старэнькага дзядка з сівой барадой і сівымі кудлатыміваласамі, апранутага ў белую кашулю і падпярэзанага дзягай ці лыкам, а мог з'яўляцца ў зааморфным: чорны калматы сабака, вуж, часам павук. Паводзіны яго таксама маглі быць рознымі. Караючы нядбайных гаспадароў за сямейныя сваркі, п'янства, брыдкаслоўе, неахайнасць і іншыя заганы і дагаджаючы тым, у якіх была моцная трывалая сям'я і захоўваліся «дзедаўскія» звычаі, дамавік, тым не менш, дапускаў бяскрыўдныя жарты ў

дачыненні да апошніх: «укідваў уначы посуд у балею, апранаў адзенне гаспадара, казытаў сонных людзей ці хаваў патрэбныя ім рэчы» [2, *530*]. Узнікала неабходнасць у залагоджванні дэманічнай істоты, заручэнні яго падтрымкі, а часам і засцярозе шляхам завязвання вузельчыка на хустцы ці прачытання замоў.

Традыцыйнае асэнсаванне вобраза дамавіка, спалучанае з адценнямі гумару, уласціва для інтэрнэт-творчасці. Так, блогер uladzimer адзначае такую рысу характару хатняга духа, як непрымальнасць залішняй цікаўнасці да яго з боку чужых людзей: «*Лёгенька саскочыўшы зь печы, выходзіць нікому ня бачны дзядок у сенцы, каб вярнуцца адтуль з чароўнай макавай доўбняй. Гэтак жа незаўважна падыходзіць ён да чужых людзей і вымярае сваёй дзівоснай прыладай скроні ды пераносьсі валацугаў. Лёгкага дотыку макавай доўбні хапае, каб напусьціць на этнографаў салодкі чмур. Недзе праз гадзіну яны ачомаюцца і, выйшаўшы з хаты на бальшак, незадаволена адрэзюмуюць: "Ат, глуха тут зь міфалогіяй". Гаспадыня, праводзіўшы позіркам дзівакоў, пачне запякаць яешню. Але без солі. Бо кожны нармальны чалавек ведае, што дамавікі салёнага не ядуць*» [3].

Тэма міфічнага распрацоўваецца ў літаратуры ў розных напрамках, часам супрацьлеглых. З намёкамі на сапраўднасць падзей спалучаецца парадыйнае пераасэнсаванне вобразаў, спробы ачышчэння свядомасці чалавека ад дэструктыўных асобасных і калектыўных міфалагізаваных формаў быцця. Не губляе сваёй актуальнасці зварот да старажытных фальклорных матываў з мэтай канструявання ўласнага літаратурнага міфа. Адпаведна і вобраз дамавіка паступова страчвае ўласцівую для яго традыцыйную атрыбутыку. Але ёсць і іншыя прыклады:

*Вандруе па клеці сівы Дамавік,*
*Стукоча маркотна яго чаравік,*
*Чапляюцца вусы за ногі, а нос*
*Да сківіцы моркаўкай шызай прырос.*

*Са скурчаных пальцаў тырчаць кіпцюры –*
*У жаху глядзяць на іх мышы з нары.*
*Вось ён, уздыхнуўшы, на бочку прысеў,*
*Расол горкі смокча і храпку грызе.*

*І дзетак чакае, што ў цёмную клець*
*Прыходзяць пад ноч на яго паглядзець...*
*Ніхто не прыходзіць – і крыўдна да слёз:*
*Сапе ён і чэша марковіну-нос* [4].

Верш Алега Мінкіна мае, здавалася б, самае класічнае апісанне знешнасці дамавіка: сівізна, доўгія вусы, кіпцюры, нос-моркаўка… Але ўвагу прыцягвае тут радок «Стукоча маркотна яго чаравік»: як вядома, прыкметай прыналежнасці хатніка да іншасвету з’яўлялася адсутнасць у яго шапкі і абутку. Такім чынам, пазбаўляючы дамавіка некаторых прыкметаў дэманічнасці, аўтар адмаўляе стаўленне да гэтай істоты як да небяспечнай.

У белым вершы Віктара Шніпа «Дом» з 13-й кватэры выганяюць сучаснага дамавіка, які «*...зранку піў каву // слухаў жалезны рок будаўнікоў метро // спяваў старыя песні продкаў // святкаваў народныя святы // чытаў уголас беларускія кніжкі // нават “Вячэрні Мінск” на беларускай мове*» [5]. І хоць намаляваны аўтарам вобраз дамавіка не падобны да фальклорнага, гісторыя мае чаканую развязку: «*І выгналі дамавіка // і разбурыўся дом*» [5].

Да рэаліяў сучаснага жыцця прывязваюцца і дамавікі, узгаданыя Марыяй Мартысевіч у кнізе «Цмокі лятуць на нераст»:

«*...дамавікі, у 24 гадзіны выселеныя спэцназам з д’юці-фры, ліквідаваных на ўсіх аўтамабільных і чыгуначных прапускных пунктах на ўсходняй мяжы Эўразьвязу,*

*дамавікі, што раней папраўлялі пустышкі ў сьне афіцэрскім дзецям на пагранзаставах,*

*дамавікі, што, чакаючы далейшых загадаў начальства зьнізу, пакуль падпрацоўвалі тут, прыбіраючы пасьля вечарынак,*

*дамавікі, што асьцярожна лізалі ейныя шчокі, калі ніхто не бачыў...*» [6, *6*].

У дадзеным творы вобраз дамавіка яшчэ ў большай ступені страчвае сваю першасную міфалагічную трактоўку. Чытач успрымае азначанае як алюзію ці абстрактны вобраз дробнага служачага і таму не надта задумваецца над «фальклорнасцю».

Найбольшую трансфармацыю вобраз хатніка набывае ў кнізе Адама Глобуса «Дамавікамерон» (не кажучы пра «Дамавікамерон новы», «Дамавікамерон найноўшы», «Дамавікамерон менскі» і інш.). Першапачаткова навелы «Дамавікамерона» ўспрымаліся як «гарадскі фальклор» ці як «неапаганскі» міф. Аднак пры дэталёвым разглядзе становіцца зразумела, што найбольшае падабенства твор мае да «антыміфа». У «Дамавікамероне» ставіцца пад сумнеў сама ідэя гарманічнага ўпарадкавання свету, якая ў фальклоры выражаецца вельмі ярка. Таму створаная аўтарам рэальнасць існуе па сваіх законах: вечнасць замяняецца імгненнямі, духоўнае каханне – цялесным. Да таго ж героі маюць рэальных прататыпаў, моцна знітаваных з савецкім ладам жыцця – упраўдомаў, кадравікоў, кіраўнікоў усіх рангаў. Вядома, што штуршком для стварэння першых навел «Дамавікамерона» стала здарэнне, што насамрэч мела месца ў жыцці адной са знаёмых пісьменніка, якая, абгаварыўшыся, назвала домакіраўніка дамавіком. А. Савіцкі сцвярджае: «Досвед “дамавікоў” Глобуса – досвед звар’яцелага побыту, хама з цемры, домакіраўніка з апраметнай. Дробнага беса, які набыў сотавік – і забыўся нумар Звера. Гэта досвед сацыяльнай смерці і вычварнага духу, на якія пачэпленыя маска гіперсексуальнасці... Бесы Глобуса – заўважаныя ім цені тых, хто прымушае ламамі драбіць граніт у залатых капальнях і працаваць шуфлямі на даху чацвёртага энергаблоку» [7, *41*]. Тэзіс аб фальклорным паходжанні герояў «Дамавікамерона» ўшчэнт разбіваецца высновай А. Савіцкага: «Дамавікі Глобуса – не бунт цела, узбуджанага чытаннем Фройда. Гэта паўсядзённасць, вызваленая ад правілаў прыстойнасці» [7, *42*]. Таму «дамавік» у

пераасэнсаванні А. Глобуса – усяго толькі пастка для даверлівага чытача, «тыповы ўзор ілжывага наймення, чарговая хованка» [8, *205*].

Такім чынам, сучасныя беларускія аўтары адначасова выкарыстоўваюць дзве супрацьлеглыя стратэгіі: арыстоцелеўскую тэхніку міфа-паэтычнага мімесісу і брэхтаўскую тэхніку адчужэння. Пры гэтым вобразы міфалагічных персанажаў, у дадзеным выпадку дамавіка – прадстаўніка ніжэйшай міфалогіі, набываюць дыялогавую функцыю. Сэнсавая энергія вобраза спалучае энергію традыцыйнага міфа-паэтычнага тэксту і літаратурнага. Перапрацоўваючы тэкставы матэрыял, пісьменнікі падпарадкоўваюць яго свайму мэтаваму заданню, актуалізуючы толькі патрэбныя ім сэнсы. Ступень трансфармацыі вобраза – ад змены асобнай уласцівасці да пераносу найменняў на іншыя, часам дыяметральна супрацьлеглыя вобразы – залежыць ад творчай індывідуальнасці аўтара і асаблівасцей яго светаўспрымання. Асабліва ярка гэта выражана ў прозе.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Максімюк, Я.* Прыручэнне дэманаў / Я. Максімюк // ARCHE – №5 (10). – 2000.
2. Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн / рэд.-склад.: С. Санько, І. Клімковіч. – 2-ое выд., дап. Мінск, 2006.
3. http://uladzimer.livejournal.com/95318.html?thread=635990
4. http://vershy.ru/content/damavik
5. http://vik-shnip.livejournal.com/589716.html
6. *Мартысевіч, М.* Цмокі лятуць на нераст: эсэ ў вершах і прозе / М. Мартысевіч. Мінск, 2008.
7. *Савіцкі, А.* Пашпартызацыя бесаў, або Койданаўскі Глобус / А. Савіцкі // ARCHE – № 5 (10). – 2000.
8. *Кісліцына, Г.* Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы / Ганна Кісліцына. Мінск, 2006.